# Бялыніцкая ДАЎНІНА

Краязнаўчая газета

№ 5 (27)
Травень
2009


# Бялыніцкі раён у другой палове 17 стагоддзя

У 1654 г. распачалася вялікая вайна паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай, у склад якой уваходзіла ВКЛ. Пад час гэтай вайны беларускія землі паспыталі жорсткае спусташэнне. У жніўні праз Галоўчын і Бялынічы на захад адыходзіла войска ВКЛ на чале з вялікім гетманам Янушам Радзівілам, якое праследвалі значна пераўзыходзячыя сілы рускіх ваяводаў Трубяцкога і Чаркаскага. 12 жніўня Радзівіл спрабаваў утрымацца ў Галоўчыне, але не вытрымаў штурму і зноў пачаў адыход. Як паведамлялі рускія ў сваім рапарце, «Радзивилл со своими людьми побежал к Борисову, бояре и воеводы Головчин повоевали и посады выжгли, и народ поимали, и из Головчина пошли за Радзивиллом к Борисову».

Вялікі гетман пераправіўся цераз Друць у Бялынічах, а яго праціўнікі - пад Цяцерынам. 24 жніўня пад Шапялевічамі ў сучасным Круглянскім раёне, ля мяжы Бялыніцкага, адбылася бітва, у якой войска ВКЛ было разбіта і рассеяна. Тэрыторыя сучаснага Бялыніцкага раёна апынулася ў руках рускіх. Крыху пазней тут размясціўся казацкі полк, сфармаваны авантурыстам Канстанцінам Паклонскім, які на той час ваяваў на баку расійскага цара.

У снежні 1654 г. Паклонскі прасіў цара, «чтоб поизволил в уездах Головчинском, Белыницком, Тетеринском, аж по самый Борисов, тем казакам чтоб волно полковнику раздати жития, которые похочет». На ліст была накладзена царская рэзалюцыя: «В Головчинском и в Белыницком и в Тетеринском казакам в приставства раздать, и корма свои и конские имать, а не грабить и насильства никакова не чинить». Думаецца, што полк Паклонскага, набраны з выпадковых людзей, не вельмі прытрымліваўся такога абмежавання. Захаваліся і асобныя запісы, паводле якіх адзін з людзей Паклонскага, Алфім Хамутоўскі, атрымаў «3 деревенки Головчинского у., что держал головчинец Александр Водовоз: Прокшиничи, Пустош, Песочное, да дворик пана Заборского со всим, что к ним лежит». (Гэта быў той самы маёнтак, які раней быў аддадзены князем Самушам Галоўчынскім у заклад мяшчаніну Івану Вадавозу - напэўна, бацьку ўпамянутага тут Аляксандра). Тады ж Андрыян Якавінскі атрымаў вёску Трылесіна.

У самым канцы снежня войска ВКЛ, якое перайшло ў контрнаступленне, часова выбіла рускіх з тэрыторыі раёна. Мясцовым жыхарам гэта, аднак, не прынесла палёгкі, бо і гэтае войска здабывала харчаванне для сябе і корм для коней у сялянскіх дварах. Больш таго, выбіўшы з Галоўчына рускі гарнізон, «вызваліцелі» абрабавалі мястэчка - быццам бы ў якасці пакарання за тое, што яго жыхары прысягнулі рускаму цару.



***Януш Радзівіл***

Увясну 1655 г. войскі Рэчы Паспалітай зноў вымушаны былі адыходзіць пад націскам рускіх, на дапамогу якім прыйшлі ўкраінскшя казакі. Цікава, што, адыходзячы на захад, Януш Радзівіл пакінуў адказным за тэрыторыю на Бярэзіне і Друці таго ж Канстанціна Паклонскага, які паспеў перайскі на яго бок і зараз змагаўся супраць рускіх.[ Думаецца, што і на гэты раз людзі Паклонскага скарысталі становішча на сваю карысць. Але хутка яго полк быў разгромлены рускімі пад Барысавам. З гэтага часу землі на берагах Друці апынуліся пад трывалым рускім кантролем ажно да 1660 г., калі ў вайне адбыўся пералом на карысць Рэчы Паспалітай.

***(Працяг на ст. 2)***

# Бялыніцкі раён у другой палове 17 стагоддзя

*(Прац. Пач на ст. 1)*

У час гэтай вайны Бялыніцкі кляштар страціў цудатворны абраз Маці Боскай, які быў у сувязі з наступленнем рускіх эвакуіраваны ў Ляхавічы. Там ён і застаўся на доўгія гады.

Тым часам у 1656 г. памёр апошні прамы нашчадак славутага Льва Сапегі - падканцлер ВКЛ Казімір Леў Сапега, спадчыннік вялізных уладанняў. Не маючы ні жонкі, ні дзяцей, у сваім завяшчанні ён шчодра надзяліў маёнткамі ўсіх больш-менш аддаленых родзічаў. У прыватнасці, спадчыннае права на Бялынічы і суседні Цяцерын, таксама набыты ў свой час Львом Сапегам у нашчадкаў князёвен Мсціслаўскіх, ён завяшчаў сумесна некальскім нашчадкам сваіх стрыечных братоў і сясцёр. Адной з іх была Ганна, дачка яго стрыечнага брата Аляксандра, якая была на той час ужо ўдавой Станіслава Нарушэвіча. У другога стрыечнага брата, Крыштофа Станіслава, засталася ўнучка Ганна Сапежанка, якой тады было 16 год. Абедзве Ганны атрымалі па чвэрці Бялыніцкага маёнтка. У Казіміра Льва Сапегі былі яшчэ стрыечныя сёстры Соф'я і Канстанцыя, адна з якіх выйшла за князя Палубінскага, а другая - за пана Шэмета. Дзецям ад гэтых шлюбаў, князю Аляксандру Гілярыю Палубінскаму і панам Аляксандру і Еўстафію Шэметам, падканцлер таксама завяшчаў дзве чвэрці Бялыніч.

Аднак уступіць у валоданне маёнткамі спадчыннікі маглі, паводле завяшчання, толькі пасля таго, як выплацяць суму ў 20 тыс. злотых, якую Казімір Леў запісаў пад заклад

*(Працяг на ст. 3)*

*Нашы героі*

## Януш Крыштафавіч Радзівіл



**Януш Крыштафавіч РАДЗІВІЛ** (2 снежня 1612, Палелі Вількамірскі пав. — 1655, Тыкоцін), польны гетман літоўскі (1646—1654), ваявода віленскі і староста барысаўскі (1653), вялікі гетман літоўскі (1654). Сын вял.гетм. літоўскага Крыштафа Радзівіл, унук Мікалая Радзівіла Рудога.

Вучыўся ў Слуцкай кальвінісцкую гімназіі, у 16 гадоў выехаў дзеля навучання за мяжу. Вучыўся ва універсітэтах Лейпцыга, Альдорфа, Лейдэна.

Меў надзвычайны вайсковы талент і быў гарачым прыхільнікам незалежнасці Вялікага Княства Літоўскага. Яшчэ ў маладосці ў Вільні ў прысутнасці манарха кінуў польскім сенатарам: «Прыйдзе час, - паны-палякі да дзвярэй не патрапяць: праз вокны іх выкідваць будзем».

У 1633, наняўшы ў Нідэрландах 1 тыс. пехацінцаў і 200 драгунаў, вярнуўся ў ВКЛ і ўзяў удзел у Смаленскай вайне. Вызначаўся ваенным талентам. Атрымаўшы ў 1646 пасаду польнага гетмана літоўскага, надзвычай паспяхова правёў свае першыя самастойныя кампаніі супраць казакаў. У ліпені 1649 разграміў пад Лоевам 15-тысячнае войска казацкага палкоўніка Крычэўскага, праз два гады тамсама - войска казацкага палкоўніка Нябабы і без бітвы здабыў Кіеў. Фундаваў кальвінісцкія зборы і школы ў ВКЛ, фінансаваў пратэстанцкія абшчыны, фінансаваў атрыманне адукацыі ў еўрапейскіх універсітэтах вялікалітоўскай пратэстанцкай моладдзю. У палітычных адносінах быў сепаратыстам - прыхільнікам ідэі адрыву ВКЛ ад Кароны. Дзеля гэтага яшчэ ў 1649 наладжваў кантакты са Швецыяй. Ненавідзеў караля Яна Казіміра. Стаўшы ў 1653 ваяводам віленскім, а ў 1654 - вялікім гетманам, засяродзіў у сваіх руках практычна ўсю ўладу ў ВКЛ.

У час вайны 1654-1667 выйграў першую бітву з маскоўскім войскам пад Шкловам (12.8.1654), у другой пад Шапялевічамі быў разбіты (24.8.1654). Быў паранены і ледзь пазбег палону, быў праведзены праз балоты мясцовым жыхаром, дабраўшыся да Барысава накіраўся на Менск збіраць войска. У 1655 годзе прадпрыняў контрнаступ. Страціўшы надзею абараніць дзяржаву, падпісаў са шведамі Кейданаўскую унію (Кейданы, 17.8.1655), пагадненне аб пераходзе ВКЛ пад шведскі пратэктарат. Памёр на 43 годзе жыцця ў Тыкоцінскім замку, аблажаны войскам Паўла Сапегі, адданым каралю. Магчыма, быў атручаны, бо на целе выступілі плямы.

# Бялыніцкі раён у другой палове 17 стагоддзя

*(Прац. Пач. на ст. 1-2)*



***Абраз Маці Боскай Бялыніцкай***

Бялыніч свайму вельмі аддаленаму родзічу, крайчаму ВКЛ Крыштофу Сапегу. Пры гэтым апошні атрымаў пажыццёвае права на Бялыніцы, а спадчыннікі маглі выкупіць маёнтак толькі ў яго нашчадкаў. Такое ж пажыццёвае права на Цяцерын было завешчана брату Крыштофа - Яну Фрэдэрыку Сапегу.

Да гэтых мудрагелістых умоў варта яшчэ дадаць, што фактычна на той момант абодва маёнткі знаходзіліся на тэрыторыі, занятай рускімі. Толькі ў 1660 г. спадчыннікі атрымалі магчымасць здзейсніць свае правы. Крайчы Крыштоф Сапега ўступіў у валоданне Бялынічамі, а яго брат - Цяцерынам. Праз год Ян Фрэдэрык выкупіў у князя Палубінскага за 15 тыс. злотых спадчыннае права на яго чвэрць Цяцерына, у сувязі з чым у складзе маёнтка ўпамінаюцца, апрача іншых, шэраг паселішчаў на поўначы Бялыніччыны: Ількавічы, Лубяны, Сіваі, а таксама Крывая Слабада (напэўна, пазнейшае Крывуліна) і Чыгрыны (Чыгіры?).

Маёнткі былі давольна моцна спустошаны за час вайны і таму, напэўна, уяўлялі сабой не вельмі прывабнае набыццё. Аб гэтым сведчыць, у прыватнасці, перапіс дымоў Аршанскага павета (так званы «тарыф падымнага»), які быў складзены праз сем год пасля вызвалення ад рускіх, у 1667 г. У тарыфе пазначана, на падставе прысягі ўладальнікаў, колькасць дымоў у маёнтках на тэрыторыі павета, з якіх адпаведна гэтаму вызначаўся памер падаткаў. Як высветлілі даследчыкі, «дым» гэтага рэестра адпавядае аднаму сялянскаму ці мяшчанскаму двару.

З тарыфа вынікае, што ў маёнтку Бялынічы на той час было 327 дымоў - ледзь не ўтрая менш, чым у вышэйзгаданым інвентары 1627 г.! Нават калі ўладальнік наўмысна крыху занізіў колькасць падданых, каб палціць меншыя падаткі, усё роўна такое значнае памяншэнне колькасці насельніцтва можна растлумацыць толькі жорсткім ваенным спусташэннем.. Калі ўлічыць, што напярэдадні 1654 г. Бялыніцкі маёнтак, напэўна, яшчэ павялічыўся ў параўнанні з 1627 г., то можна сцвярджаць, што ў выніку вайны ён страціў, прынамсі, дзве трэці свайго насельніцтва.

У тарыфе 1667 г. прыгадваюцца і іншыя маёнткі на тэрыторыі сённяшняга Бялыніцкага раёна. У Галоўчыне, якім тады валодаў харунжы ВКЛ Зыгмунд Служка, налічвалася 179 дымоў, а ў належачым Бялыніцкаму кляштару кармелітаў маёнтку Цехцін - 30. Апрача таго, упершыню згадваюцца два дзяржаўных маёнтка («дзяржавы») на паўночным захадзе раёна, якія былі папярэдне вылучаны з таксама дзяржаўнага Барысаўскага староства: Клеўка (у ёй было ўсяго 8 дымоў) і Эсьмоны (33 дымоў), якія знаходзіліся ў карыстанні ад- паведна Самуэля Прыборкі і Яна Драздовіча.

Барысаўскае староства ахоплівала паўночна-заходнюю частку Бялыніцкага раёна здаўна, але ўпамінанні асобных паселішчаў у складзе гэтага староства да сярэдзіны XVII стагоддзя амаль не сустракаюцца. Першы вядомы нам інвентар гэтага староства, у якім пералічаны ўсе ўваходзячыя ў яго сёлы, быў складзены ў 1670 г. з нагоды перадачы яго тагачасным старостам, полацкім ваяводам Казімірам Янам Сапегам, у арэнду Даніэлю Кастравіцкаму. З інвентара можна даведацца, што на тэрыторыі раёна да староства, дакладней - да яго Забаброўскай воласці належалі сёлы Заазер’е (2 двара), Пупса (6), Кулакоўка (1), населеная земянамі Вольніца (2) і, напэўна, Смогілеўка з 2 дварамі (паселішчаў з такой назвай было ў мінулым два, адно з іх - у сучасным Круглянскім раёне).

Можна дадаць, што ў тарыфе 1667 г. чамусці прапушчаны яшчэ адзін маёнтак - Карытніца, вылучаная, як ужо гаварылася вышэй, са складу Любашанскага староства. З іншых крыніц вядома, што ў 1660 г., пасля вызвалення ад рускіх, гэты маёнтак быў пажалаваны ў якасці лена (гэта значыць - з правам перадачы ў спадчыну толькі да прамых нашчадкаў па мужчынскай лініі) Яну Казіміру Гінтаўту. Гэты маёнтак па-ранейшаму ахопліваў два сяла - Карытніцу і Прыборкі.

***(Працяг на ст. 4)***

# Бялыніцкі раён у другой палове 17 стагоддзя

(Прац. Пач. на ст. 1-3)

Крайчы ВКЛ Крыштоф Сапега, як і яго брат Ян Фрэдэрык, імкнуўся выкупіць спадчыннае права на Бялынічы. Далейшы лёс гэтага маёнтка можна прасачыць на падставе судовай справы аб валоданні ім, якая разгарэлася ў XVIII стагоддзі паміж Радзівіламі і князямі Агінскімі. У сувязі з гэтай справай прыгадваюцца і больш раннія падзеі.

Першым свайго спадчыннага права пазбыўся той жа князь Палубінскі, які ў 1661 г. саступіў сваю чвэрць Бялыніч Крыштофу Сапегу за 5 тыс. злотых. У наступным годзе тое ж зрабіла Ганна, удава Станіслава Нарушэвіча. Што да другой Ганны, то яна памёрла незамужняй у 1667 г., пасля чаго апекуном яе маёмасці быў прызначаны Палубінскі. У 1669 г. ён прадаў і гэтую частку спадчыны Алене з Саламярэцкіх, удаве памёршага ў 1665 г. Крыштофа Сапегі. Такім чынам, у яе руках апынулася спадчыннае права на тры чвэрці Бялыніцкага маёнтка. Магчымасць выкупіць сваю чвэрць захавалі толькі нашчадкі братоў Шэметаў, якіх таксама ўжо не было ў жывых.

У Аляксандра Шэмета засталіся тры сына: Казімір, Яраслаў і Мельхіёр, якія пасля яго смерці знаходзіліся пад апекай таго ж князя Палубінскага. У 1672 г. яны па прыкладу іншых суўладальнікаў прадалі сваю долю Алене Сапежынай. Што да Еўстафія, то ў яго засталіся сыны Міхал і Ян, якія сваю долю прадалі Палубінскаму, а ён за 7 тыс. злотых адразу ж перапрадаў яе сынам Аляксандра Шэмета. Тыя ў сваю чаргу прадалі яе ўдаве крайчага ў 1675 г., прычым ужо за 14 тыс. злотых. Такім чынам, працэс набыцця Бялыніч у поўную ўласнасць Крыштофам Сапегам і яго жонкай расцягнуўся на 14 гадоў.

Яшчэ праз два гады, у 1677 г., адбыўся падзел маёнткаў паміж сынамі Крыштофа і Алены Сапегаў. У выніку Бялынічы дасталіся сярэдняму з трох сыноў - семнаццацігадоваму Андрэю. У наступным годзе ён ажаніўся з Янай Хадкевіч, якой запісаў пажыццёвае права на свае маёнткі пад забеспячэнне сумы ў 100 тыс. злотых. У 1681 г. Андрэй Сапега памёр. Законным спадчыннікам застаўся яго малодшы брат Уладзіслаў, які неўзабаве быццам бы выплаціў Яне грошы, запісаныя на маёнтках яе мужам. Праўда, пры гэтым называецца сума не ў 100 тыс., а толькі ў 22 тыс. 470 злотых.

Далей адбылася даволі цьмяная гісторыя, якая дала пачатак доўгім спрэчкам і судовым працэсам. Не чакаючы смерці ці шлюбу ўдавы свайго брата, якая мела пажыццёвае права на Бялынічы, Уладзіслаў Сапега ў 1685 г. прадаў гэты маёнтак (дакладней, спадчыннае права на яго) удаве Міхала Караля Радзівіла, Кацярыне з Сабескіх за вялікую суму ў 300 тыс. злотых. Гэта магло мець практычныя наступствы толькі ў выпадку, калі б маёнтак быў ужо цалкам выкуплены. У іншым выпадку Кацярына набывала толькі права выкупіць яго ў далейшым.

У сваю чаргу Яна Сапежына, так і не выйшаўшы зноў замуж, памёрла ў наступным годзе, завяшчаўшы грашовую суму на Бялынічах сваёй маці - Ізабеле Хадкевіч. Пры гэтым яна агаворвала, што Уладзіслаў Сапега ці яго правапераемнікі мусяць яшчэ выкупіць гэты маёнтак. Гэта сведчыць, што сума, агавораная ў завяшчанні, не была цалкам выплачана спадчыннікам яе нябожчыка-мужа. Дзіўна, што Кацярына Сабеская, якая заплаціла Уладзіславу Сапегу ўтрая больш, чым каштаваў запіс яго брата, ні ў той момант, ні потым не зрабіла ніякіх спроб канчаткова выкупіць маёнтак, каб стаць яго рэальнай уладальніцай, хаця без гэтага тыя выдаткі, якіх каштавала выплата грошай Уладзіславу, гублялі ўсякі сэнс. Тым не менш пры падзеле маёнткаў паміж яе сынамі Юрыем Юзэфам і Каралем Станіславам Радзівіламі ў 1688 г. прыгадваюцца і Бялынічы, якія (дакладней, права выкупу якіх) дасталася першаму з іх. Але праз год ён памёр, і яго малодшы брат Караль Станіслаў далучыў яго ўладанні да сваіх.

Тым часам Ізабела Хадкевіч на падставе завяшчання сваёй дачкі не толькі рэальна валодала Бялынічамі, але ў 1696 г. паразаклала іх князю Казіміру Дамініку Агінскаму, узяўшы з яго 16 тыс. злотых за права атрымаць канчатковы выкуп. Між тым Караль Станіслаў Радзівіл так і не сабраўся гэты выкуп унесці, і таму фактычным уладальнікам Бялыніч зрабіўся Агінскі.

Дарэчы, па жаночай лініі Казімір Дамінік Агінскі быў унукам Ганны Сапежанкі- Нарушэвічавай, якой у свой час паводле завяшчанння Казіміра Льва Сапегі дасталася чвэрць Цяцерына і Бялыніч. У адрозненне ад Бялыніч, свае правы на Цяцерын яна не

(Заканч. на ст. 5)

# Бялыніцкі раён у другой палове 17 стагоддзя

***(Заканч. Пач. на ст. 1-4)***

прадала, а завяшчала чатыром сынам і дачке Яне Тэадоры. У сваю чаргу яе сыны адмовіліся ад гэтай спадчыны на карысць сястры. Яна Тэадора Нарушэвіч з 1660 г. была жонкай князя Яна Агінскага, пазнейшага полацкага ваяводы, і адным з сыноў ад гэтага шлюбу быў вышэй- згаданы Казімір Дамінік Агінскі. Таму разам са сваімі братамі Аляксандрам і Марцыянам ён валодаў спадчыннымі правамі на Цяцерын. Зараз ён дадаў да сваіх уладанняў і сумежныя Бялынічы - праўда, ужо толькі на закладным праве.

***Уладзімір Насевіч***

# Аб паходжанні назвы вёскі Пупса

Сёння рэдкі бялынічанін адкажа вам, дзе знаходзіцца вёска Пупса. Напрыканцы 1964 года яе перайменавалі ў Майск. Мабыць, у гонар месяца траўня (мая)...

Аднак, як сцвярджае ўраджэнец гэтага паселішча, кандыдат матэматычных навук Мікола Лапа, і само найменне вёскі Пупса не адпавядае гістарычнай праўдзе.

Спадар Мікола сцвярджае, што да 1793 года (другі гвалтоўны падзел Рэчы Паспалітай) яго родная вёска называлася Пужа.

Пры складанні спісаў далучаных паселішчаў пісар памылкова прачытаў найменне вёскі Пужа як Пупса.

***М. Болінскі***

# Ігар Пушкін. Узброены супраціў ва Усходняй Беларусі (20–30-я гады XX ст.)

***У кнізе магілёўскага гісторыка асвятляюцца малавядомыя падзеі ўзброеных выступленняў насельніцтва Усходняй Беларусі супраць бальшавіцкай улады ў 20—30-я гады мінулага стагоддзя.***




Пабачыла свет кніга магілёўскага гісторыка Ігара Пушкіна «Узброены супраціў ва Усходняй Беларусі (20—30-я гады XX ст.)». У кнізе асвятляюцца малавядомыя падзеі ўзброеных выступленняў насельніцтва Усходняй Беларусі супраць бальшавіцкай улады ў 20—30-я гады мінулага стагоддзя.

Аўтар асвятліў прычыны, сутнасць і гістарыяграфію беларускага ўзброенага супраціву. У канцы маецца бібліяграфія па тэме даследавання. Зборнік змяшчае больш за 110 дакументаў, каторыя аб'ектыўна асвятляюць тагачасныя грамадска-палітычныя падзеі. Аснову кнігі складаюць дакументы з дзяржаўных архіваў Беларусі. Разлічана на навукоўцаў, настаўнікаў, студэнтаў, усіх тых, хто цікавіцца айчыннай гісторыяй. У якасці навуковых рэцэнзентаў кнігі выступілі доктар гістарычных навук, прафесар А. П. Грыцкевіч і кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. Р. Агееў.

Кніга выдадзена пры падтрымцы МГА «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына

# Увага: конкурс!

Актывісты антыядзернага руху Бялыніцкага раёна, грамадская ініцыятыва “Крок,” аб’яўляюць аб правядзенні конкурса дзіцячага малюнка “Дзеці Беларусі – за без’ядзерную будучыню”, удзел у якім могуць прыняць усе навучэнцы школ і выхаванцы дзіцячых садкоў Бялыніцкага раёна. Работы на конкурс можна прадастаўляць па адрасе: г. п. Бялынічы, Дом быта (1 паверх), крама “Рубон” (звяртацца да Алега Мяцеліцы, кантактны тэл. 8-0296-203210) на працягу траўня і першай паловы чэрвеня 2009 г. Пераможцы конкурса будуць узнагароджаны каштоўнымі падарункамі.

*Традыцыі нашага краю*

# Стараверы бялынiччыны

Напрыканцы 80-х гадоў 19 стагоддзя на тэрыторыі Эсьмонскай воласці ўзніклі хутары стараабрадцаў, якія перасяліліся сюды, жадаючы захаваць вернасць старадаўняй дзядоўскай веры, знайсці больш прыстойныя і спакойныя ўмовы для жыцця. Прыкладна ў гэты ж самы час узнікла і вёска, жыхарства якой складалася таксама з сялянстаравераў, - Старая Клёўка.

Перабраліся на Эсьмоншчыну стараабрадцы ў асноўным з былой Віленскай губерніі. А выбралі яны гэтыя мясціны зусім невыпадкова, паспрыялі таму абставіны.

Тутэйшы поп, які валодаў угоддзямі ў ваколіцах сучаснай Стара-Клёўкі, распрадаваў сваю зямлю. Вось прыезжыя людзі і набылі яе. Паколькі стараабрадцы былі майстравітымі людзьмі – умелі рабіць павозкі, калёсы, вупраж і іншыя, неабходныя ў кожнай сялянскай гаспадарцы рэчы і прылады – паспрыяла іхняму пасяленню тут і наяўнасць у навакольных лясах дуба, які быў асноўнай сыравінай для развіцця саматужнага рамяства.

Староверскія сем'і, як правіла, набывалі ва ўласнасць зямлі не менш за 10 валокаў. Цяперашнія нашчадкі тых першапасяленцаў, не-не, ды й згадаюць часам у гутарцы, што іхні, скажам, прадзед валодаў 15, 25 валокамі. Праўда, валокі тыя нярэдка знаходзіліся ў розных мясцінах – і пад Міхасёўкай, і ў Стараселлі.

Старажылы згадваюць, што непадалёку ад Старой Клёўкі знаходзіліся і хутарскія сядзібы стараабрадцаў. Некалькі хутароў узнікла на шляху з вёскі Кулакоўка ў вёску Міхасёўка. Гаспадарылі на іх сем'і Сімкі Аўдзеева, Сяргея Гвоздзева, Афяценія Прышчэпава і некаторыя іншыя стараверы.

Перад пачаткам Другой сусветнай вайны хутары гэтыя, як і ўсе астатнія, ссялілі дзеля таго, каб людзі ўступілі ў калгасы.

Сем'і з хутароў, што знаходзіліся на шляху з Кулакоўкі ў Міхасёўку, пераехалі на сталае жыхарства ў Старую Клёўку і ўступілі ў тамашні калгас "Другая сесія".

Да вайны ў гэтай вёсцы, якая па сутнасці з'яўлялася буйным культурна –асветніцкім і духоўным асяродкам бялыніцкіх стараабрадцаў, дзейнічала школа з рускай мовай навучання, існавала староверская царква (малітоўны дом), а, бадай, ці не кожная сям'я мела шмат старадаўніх, "правільнай веры", царкоўных кніг і ікон. Праўда, вельмі шмат іх загінула ў час вайны. У пядзідзесятыя гады мінулага стгоддзя была разбурана і староверская царква – з яе пабудавалі ў Стараселлі вясковы клуб. Святаром у царкве да самай ліквідацыі яе служыў Сяргей Гвоздзеў, а ўтрымлівалася бажніца на ахвяраванні саміх прыхаджанаў.

Сяляне-стараверы строга і няўхільна прытрымліваліся сваіх абрадаў, законаў, традыцый. З трохгадовага ўзросту дзіцяці пад прыглядам бацькоў ужо павінна было захоўваць пасты.

Старыя ніколі не галіліся. Безбародага памерлага адзінаверцу яны маглі нават не пахаваць па свайму абраду.

Строгімі былі парадкі і пры заключэнні шлюбу. Сям'я магла быць створана толькі паміж адзінаверцамі.

Заўсёды па суботах пасля абеду са старавераў ужо ніхто не працаваў, а бліжэй да вечара ўсе яны спяшаліся ў малітоўны дом на вячэрнюю службу. У нядзелю багаслужэнні ў царкве пачыналіся а 4 гадзіне раніцы. Затым служылі абедню, маліліся і ўвечары.

Старыя людзі з ліку мясцовых стараабрадцаў да сённяшняга дня прытрымліваюцца ўсіх старавeрчых законаў, традыцый і абрадаў. Маладыя ж выконваюць толькі галоўныя, найбольш значныя.

У некаторых сем'ях захаваліся стрыя кнігі, па якіх праводзяць цяпер розныя абрады.

Напрыклад, пры пахаванні нябожчыка абавязкова апранлі ў доўгую сарачыцу і падвязвалі паяском. Паверх адзення апраналі саван, адным кутком палатна закрывалі твар памерламу і, доўга молячыся, распачыналі абрад провадаў. Пасля гэтага нельга было нябожчыку адкрываць твар, бо ў такім выпадку трэба было выконваць абрад провадаў з самага пачатку.

Стараверы хаваюць нябожчыка, як праваслаўныя і каталікі, на трэцці дзень.

Дакладна і строга рэгламентаваны ў мясцовых старавераў і абрад хрышчэння.

Калі дзіця ў сям'і нараджалася нядужым, хворым, то сам бацька павінен быў адразу ж па нараджэнні яго пахрысціць немаўля – каб не памёр нехрышчоным.

Хрост, паводле сведчання жыхаркі Старой Клёўкі Надзеі Рыгораўны Баравіковай 1932 года нараджэння, праводзіўся наступным чынам: неабходна было перахрысціцца самому і тройчы са словамі "Во имя отца, и сына, и святого духа" акунуць дзіця ў ваду,

**(Заканч. на ст. 7)**

# Стараверы бялыніччыны

(Закнч. Пач. на ст. 6)

а на слова «Амінь” выцягнуць яго з вады.

Калі нядужае дзіця выжывала, пазней яго трэба было перахрысціць у царкве. Імя давалі выключна па імяннному календары.

У царкве напачатку выканання абраду хрышчэння дзіця поп ставіў кумоў і дзіця да ўсходу тварам, рукі яны трымалі далонямі ўверх. Дзіця трымае на руках бабка. Поп чытае малітву да Святой Багародзіцы, трапары.

Затым дзіця паварочваюць тварам на захад. Тое ж самае павінны зрабіць і кумы. На гэты раз свае далоні яны паварочваюць уніз.

Поп задае пытанні, кумы адказваюць за дзіця. У выпадку, калі хрысціцца дарослы, на пытанні святара ён адказвае сам.

Пытанні і адказы прамаўляюцца кожныя па тры разы.

Пытанне: “Адмаўляешся ад сатаны?”

Адказ: “Адмаўляюся ад сатаны”.

Пасля абраду адрачэння ад сатаны кумы плююць тройчы пад левую нагу. Калі хрысціцца дарослы, гэта ён, вядома ж, робіць сам.

Затым святар становіцца тварам на захад, і, трымаючы дзіця тварам на ўсход, апускае яго ў купель са словамі “Во имя отца, и сына, и святого духа”. На слова “Амінь” дастае з вады.

Гэта працэдура абрада хрышчэння паўтараецца тройчы.

Затым па тры разы чытаюцца малітвы і псалмы, пасля гэтага крыжык з гайтанам (адмысловай вяровачкай) ускладаецца на дзіця. Хрышчонага апранаюць у сарачыцу і падвязваюць паяском.

На працягу трох дзён нельга здымаць адзенне і купаць дзіця.

На завяршэнне гэтага абраду хрышчэння поп прыкладае дзіця да крыжа (дарослы цалуе сам0 і чытае кумам павучэнне: правілы царкоўныя не парушаць, заўсёды быць у малітве, даць таму, хто церпіць нястачу, любіць людзей і не мець гонару да славалюбства.

**Святлана Буйніцкая**

# Якія пісьменнікі нарадзіліся на Бялыніцкай зямлі?

Першым з бялынічанаў, хто адчуў у сябе патрэбу пісаць, быў Зянон Фіш (псеўданім Тадэвуш Падаліца). Нарадзіўся ён у вёскі Ключыкі. Зянон Фіш аб’ехаў шмат еўрапейскіх краін. Вынікам падарожжаў стала некалькі кніг дарожных мемуараў, якія выдадзены на польскай мове. Вобразнасць слова З. Фіша набліжае яго падарожныя запісы да ўзроўню мастацкай літаратуры.

Пісьменнік мікола Цэлеш нарадзіўся ў 1900 годзе ў вёсцы Заазер’е. Працаваў у Варонежы і на шахтах Данбаса, з 1924 і да самай вайны жыў у Менску. Падчас акупацыі сям’я была вывезена ў Германію, адкуль Целешы перабраліся ў Амерыку. Прапаў без вестак у 1970 годзе.

З’яўляецца аўтарам кніг “Апавяданні паляўнічага”, “Буська”, “Са стрэльбай і сабакам”, “Курылка”, “Знаходка”.

Бялынічы з’яўляюцца радзімай і вядомага даследчыка літаратуры, празаіка Янкі Шарахоўскага. Найбольшую вядомасць яму прынеслі кнігі “Пясняр народных дум”, зборнікі апавяданняў “Срэбная раніца”, “Сплочаны доўг”, “Сердалікавая бухта”.

У Бялынічах нарадзіўся і вядомы расійскі паэт Ігар Шкляроўскі. Першы верш надрукаваў у 1956 годзе. Выдаў зборнікі паэзіі “Я іду”, “Лодка”, “Фартуна”, “Непазнаная сіла”, “Госць”, “Тайнік”, паэмы “Слова пра Кулікова поле”, “Слова пра мір”, піша прозу.

Вячаслаў Казакевіч таксама нарадзіўся ў Бялынічах. Закончыў філфак МДУ імя Ламаносава. Аўтар паэтычных зборнікаў “Праздник в провинции”, “Кто назовет меня братом?” і іншых.

Дзяцінства аўтара кніг паэзіі “Спасибо, жизнь», «Три слова» Аляксандра Мельнікава прайшло ў в. Васількі. Пасля заканчэння Ленінградскага медінстытута прцаваў урачом у Магілёве.

Сатырык Рыгор Яўсееў нарадзіўся ў вёсцы Барок у 1942 годзе. Выдаў больш за дзесятак кніжак сатыры, сярод іх “Верабей пад воблакамі”, “Мох на бярвенні”, “Дзядзькавы памочнікі” і інш., дыялектычны слоўнік “Маці казала так…”

Першую гумарэску Васіль Найдзін, які нарадзіўся ў в. Бярозаўка, надрукаваў у вайсковай газеце “Страж Балтыкі”. Аўтар гумарыстычных кніг “Аддаю вам”,

(Заканч. на ст. 8)

## Якія пісьменнікі нарадзіліся на Бялыніцкай зямлі?

*(Заканч. Пач. на ст. 7)*

", "Сустрэнемся ў Барселоне", "Кветка кактус".

Батракова ( Арахоўская) Наталля Мікалаеўна нарадзілася ў Бялынічах у 1964 годзе. Закончыла СШ № 2 г. п. Бялынічы,потым Беларускі дзяржаўны універсітэт інжынераў транспарту (Гомель), працавала ў розных транспартных і страхавых кампаніях. Піша на рускай мове прозу і паэзію. Выдала кнігі «Состояние души», «Территория души», «Сто сорок жизненных мгновений», «Площадь согласия».

***"Згукі мінуўшчыны"***

## Хто з жыхароў раёна ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза?

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 29 кастрычніка 1943 года за разведку перапраў праз Днепр і атрыманне каштоўных разведданых яго быў удастоены бялынічанін Іосіф Вікенцьевіч Свідзінскі.

Гэта званне ў баях на бялыніцкай зямлі было прысвоена артылерысту Б. Хігрыну, партызану Л. Лорчанку, камандзіру 121 партызанскага палка А. Касаеву, камандзіру роты 42 Смаленскай стралковай дывізіі С. Церашкевічу.

## ЕЎРАПЕЙСКІ ГУМАНІТАРНЫ УНІВЕРСІТЭТ у Вільні

**абвяшчае набор студэнтаў на бакалаўрскую праграму**

«Гісторыя Беларусі і культурная антрапалогія»

**(дзённая і завочная форма навучання)**

«Гісторыя Беларусі і культурная антрапалогія» – гэта

- *фундаментальная падрыхтоўка ў галіне гуманітарных і сацыяльных навук*
- *грунтоўныя веды па беларускай, еўрапейскай і сусветнай гісторыі, культурнай антрапалогіі, археалогіі, этналогіі*
- *авалоданне дзвюма замежнымі мовамі*
- *атрыманне дыплома бакалаўра гісторыі дзяржаўнага ўзору Літоўскай Рэспублікі, які прызнаецца ў Еўропе*
- *магчымасць вучыцца і жыць у адным з прыгажэйшых гарадоў Цэнтральна-Усходняй Еўропы, у якім усё яшчэ жыве беларуская гісторыя*

**Выкладанне вядзецца пераважна па-беларуску і па-руску, на старэйшых курсах таксама на англійскай, французскай ці нямецкай мове. Апроч гэтага прапануецца асобны курс літоўскай мовы і культуры.**

**Сярод выкладчыкаў вядомыя ў Беларусі і за яе межамі гісторыкі, этнолагі, археолагі.**

**Падрабязную інфармацыю аб умовах паступлення і навучання можна знайсці на сайце www.ehu.lt**

Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка
камунікат
www.kamunikat.org

Бялыніцкая даўніна

Краязнаўчая газета.Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна

Бялыніцкі раён, в. В.Машчаніца.
тэл. 37-110. Рэдактар Вырвіч Б.І.
Наклад. 299 асобнікаў